Выстаўка. Кніжная выстаўка, прымеркаваная да Дня славянскага пісьменства і культуры, адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, паведамілі ў НББ. У многіх краінах Усходняй і Паўднёвай Еўропы 24 мая ўшаноўваюць памяць вялікіх славянскіх асветнікаў Кірыла і Мяфодзія. У Беларусі гэты дзень адзначаецца як Дзень славянскага пісьменства і культуры. На выстаўцы прадстаўлена каля 50 дакументаў, перыяд выдання якіх складае больш за 120 гадоў. Тут можна таксама пабачыць работы рускіх і заходнееўрапейскіх аўтараў, першыя Кірыла-Мяфодзіеўскія зборнікі і падручнікі царкоўнаславянскай мовы. Дапаўняюць экспазіцыю факсімільныя выданні. Выстаўка будзе працаваць да 30 ліпеня.